# Г. К. СЕМЯНЬКОВА: «ГАВАРЫ "ДЗЯКУЙ" ЖЫЦЦЮ ЗА КОЖНЫ ПРАЖЫТЫ ДЗЕНЬ»

***Строгі, патрабавальны, але добразычлівы выкладчык — менавіта так можна ахарактарызаваць дацэнта кафедры беларускага мовазнаўства Галіну Канстанцінаўну Семянькову. 23 снежня ёй спаўняецца 50 гадоў. Галіна Канстанцінаўна скончыла Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С. М. Кірава (сёння — ВДУ імя П. М. Машэрава). Ужо амаль 30 гадоў педагог працуе ў роднай альма-матар.***

***Выкладчык заўсёды ўмее знайсці паразуменне з моладдзю. Студэнты, характарызуючы Галіну Канстанцінаўну, падкрэсліваюць, што яна ідзе ў нагу з часам.***

***Шмат чаго пра юбіляра можна даведацца з нашай анкеты.***



З 1991 года працуе ў ВДУ імя П. М. Машэрава.
З 2002 года — кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства.
Выконвае абавязкі вучонага сакратара савета ўніверсітэта.

**Самы незабыўны падарунак на мой дзень нараджэння** — гэта калі мае дзеці, чакаючы мяне, накрылі святочны стол. Было вельмі прыемна ўсведамляць, што ты патрэбны, жаданы, чаканы. А яшчэ я люблю падарункі «проста так», не з нагоды свята ці дня нараджэння: такія знакі ўвагі больш шчырыя, больш душэўныя, яны ідуць ад самага сэрца, бо не з'яўляюцца абавязковым «атрыбутам» свята.

**Калі б я не была выкладчыкам, то стала б...** Я не ведаю, кім бы я магла стаць. З дзяцінства гуляла ў настаўніцу: рассаджвала вакол сябе лялек, разгортвала журнал — і пачынаўся ўрок. Найвялікшым шчасцем было, калі да мяне прыходзіў мой сябар: мы з ім таксама гулялі ў школу. Здагадваецеся, хто быў настаўнікам?

**Люблю сваю працу за** магчымасць даць іншым тое, чым валодаеш сам, — веды, вопыт, жыццёвую мудрасць. А таксама за тое, што моладзь прымушае нас трымаць сябе ў тонусе, вучыць працай адносіцца да няўдач, не дае нам старэць.

Той, хто працуе з моладдзю, сам не старэе.

**Мая галоўная станоўчая якасць — гэта** адказнасць: калі бяруся за нейкую справу, то стараюся рабіць яе на поўную сілу, з поўнай аддачай. Не люблю халтурыць, заўсёды адчуваю дыскамфорт, калі прыйшлося штосьці зрабіць не зусім якасна.

**Я ніколі не змагла б даравáць** і не даравала здрады. Здрады сябрам, бацькам, каханым. Здрады той справе, якую лічыш сэнсам свайго жыцця. Здрады самому сабе.

**У вольны час я** падарожнічаю па Беларусі. Мінулым летам упершыню ўбачыла возера Нарач. Пасля гэтага зразумела, чаму яго называюць беларускім морам: яно такое вялікае, што супрацьлеглага берага не відаць. У кожным возеры ці рацэ, на якіх бываю, абавязкова плаваю — гэта ўжо традыцыя. Цікава, што кожны горад адметны, непаўторны, ён вылучаецца не толькі сваёй гісторыяй, але і сваім аздабленнем: у Лідзе на адным з галоўных перакрыжаванняў стаіць вялізная ладдзя, у ёй растуць кветкі; у Гомелі ёсць сквер, у якім у зменшаным выглядзе прадстаўлены архітэктурныя цуды: Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў форме алмаза, Вялікая Кітайская сцяна, нахіленая Пізанская вежа і інш. Стараюся наведваць культурныя мерапрыемствы, што ладзяцца ў розных кутках нашай Радзімы: была на рыцарскім фэсце ў Мсціслаўлі, на святкаванні Купалля ў Александрыі. Шмат куды пакуль што не даехала (на свята «Вішнёвы фестываль» у Глыбокае, напрыклад), аднак збіраюся ліквідаваць гэты недахоп.

**Мая настольная кніга — гэта...** Цяжка назваць нейкую адну кнігу. Час ад часу перачытваю Уладзіміра Караткевіча, Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна. Пасля наведвання тэатра стараюся пазнаёміцца з творам, па якім быў пастаўлены спектакль. Нядаўна адкрыла для сябе Паўла Каэльа, уражана глыбінёй яго думак. Падзяляюся некаторымі з іх: «Жыццё кароткае. Няма часу пакідаць важныя словы нясказанымі», «Калі чаго-небудзь моцна захочаш, увесь Сусвет будзе садзейнічаць таму, каб жаданне тваё збылося», «Калі я — частка твайго Лёсу, калі-небудзь ты вернешся да мяне», «Усё заўсёды заканчваецца добра. Калі ўсё закончылася дрэнна, значыць, гэта яшчэ не канец», «Нішто ў гэтым свеце не адбываецца выпадкова». А кніга Ронды Берн «Сакрэт» змяніла маё жыццё...

**У людзях я цаню** шчырасць. Не цярплю ліслівцаў і падхалімаў, нацягнутыя ўсмешкі і няшчырыя словы.

**Кожны чалавек хоць раз у сваім жыцці павінен...**

- Узляцець над зямлёй (на самалёце, паветраным шары, аэраплане або на чым-небудзь іншым), каб убачыць, якая прыгожая зямля з вышыні, як адлюстроўваецца сонца ў шкельцах азёр і вадасховішчаў, як прыгожа кучаравяцца аблокі — так і хочацца дакрануцца да іх рукой і пагладзіць іх мяккія спіны.
- Убачыць мора, каб адчуць яго моц і сілу, каб пачуць на свае вушы і на ўсё жыццё запомніць яго шум.
- Праводзіць вячэрнюю і сустрэць ранішнюю зару, каб убачыць яе непаўторную прыгажосць і ўсвядоміць, як хутка рухаецца наша планета.
- Наведаць Брэсцкую крэпасць, каб дакрануцца да сцен, якія яшчэ памятаюць страх і боль, што адчувалі яе абаронцы.
- Паверыць у цуд — і ён абавязкова адбудзецца!

**Правілы, па якіх я жыву, якія з'яўляюцца часткай маіх перакананняў...**

Такіх правіл шмат. Вось некаторыя з іх:

- Адносься да іншых так, як ты хацеў бы, каб адносіліся да цябе.
- Гавары «дзякуй» жыццю за кожны пражыты дзень.
- Хочаш быць шчаслівым — будзь! Зараз! У гэтае імгненне!
- Вучыцца ніколі не рана і ніколі не позна.